УДК: 61:615.1(043.2)
ББК: 5:52.8
ISBN: 978-985-21-0532-3



***Окунева Д. Д., Зубкоўская Н.С.***

# НАРОДНАЯ МЕДЫЦЫНА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

***Навуковы кіраўнік ст. выкл. Носік А.А.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

З даўніх часоў людзі выкарыстоўвалі народную медыцыну і перадавалі веды з пакалення ў пакаленне. Гэта былі і розныя лекавыя травы, веды пра якія выкарыстоўваюцца ў фармакалогіі і па сенняшні дзень, і малітвы, і нават магія. Большасць метадаў такой разнавіднасці медыцыны захавалася і выкарыстоўваецца сучаснымі жыхарамі нашай краіны, нават калі традыцыйная медыцына робіць вялікія крокі ў паляпшэнні старых і даступнасці новых метадаў лячэння чалавека з дапамогай новых тэхналогій. Чаму ж яны такія папулярныя? Гэта пытанне і ўяўляе актуальнасць абранай тэмы, паколькі дадзеная з’ява ўсё яшчэ мае месца ў сучасных рэаліях.

Чаму народнай медыцыне давяраюць мільёны? У ходзе сваей работы пры дапамозе апытальніка была ўсталявана зваротная сувязь з жыхарамі Беларусі і вызначаны найбольш папулярныя сродкі нетрадыцыйнага лячэння сярод насельніцтва нашай краіны. Але каб зрабіць параўнальны аналіз развіцця метадаў народнай медыцыны, трэба дасканала разгледзець пытанне яе ўзнікнення. Для дасягнення дадзенай мэты ўзялі за аснову “Большую энциклопедию народной медицины” Ізотавай М. А., Сарафанавай Н. А., а таксама некалькі нумароў вядомай газеты “Народный доктор” і розныя інтэрнэт-артыкулы.

Репозиторий БГМУ